**Арцюх Дзмітрый**

# Вясна ў кароткім паліто...

**Вершы**

KAMUNIKAT.org

**Мінск 2006**

**Мастацкая літаратура**

У сваёй першай кнізе “Вясна ў кароткім паліто...” аўтар параўноўвае каханне з порамі года. Гэта і вясна, калі нараджаецца пачуццё, і лета, калі яно развіваецца, і восень, калі згасае, і зіма, калі яго прыходзіцца чакаць. Але, як і ў прыродзе, у жыцці таксама бывае вясна зімой і зіма летам. Назіраючы за гэтым, паэт уступае ў барацьбу з лёсам за права штохвілінна жыць вясной.



KAMUNIKAT.org

* * *

Я — Зміцер,
Я — нашчадак Адама.
Думаю пра пачатак
Свой,
Які згубіўся
Ў буслiным плачы
І застаўся назаўсёды,
Як “у” нескладовае
Ў нашай мове.

* * *

Прыдумаў рай касмічны для сябе.
З душой і целам у адным адзенні
Лячу, гукаю: “Ты не тут? Ты дзе?”
Насустрач — зоркі, постаці і цені.

Цябе няма... Ты там, Ты на Зямлі!
І я вяртаюся, бо ў космасе самотна.
Лячу туды, дзе мы з Табой былі.
... Рай на Зямлі: сапраўдны, не халодны!

* * *

Ах гэты водар на маёй падушцы
У доме тым, дзе плача саксафон!
Мне гэтай ноччу вочы не заплюшчыць,
Ізноў пра нас мне нагадае ён.

Зноў буду вершы я пісаць самотны,
А сэрца плакаць будзе і... спяваць.
Як цяжка жыць, не ведаючы ноты,
Якія шчасцем могуць кіраваць.

* * *

Не лягу спаць пакуль душа так плача,
Пакуль у сэрцы ные і баліць,
Пакуль яна нібыта мячык скача,
Пакуль у вершах прымушае жыць.

І я жыву. І плачу вершы-песні.
Яны гучаць — і робіцца лягчэй…
Як гэта добра: я сягоння вечны,
Я скінуў ношу са сваіх плячэй.

* * *

Два месяцы шчасця сляпога
І самы пякучы мароз...
Чаму я не слухаў нікога?
Навошта цяпло Табе нёс?

Яго адрываў ад сябе я
І кідаў. Не ведаў куды.
Шкада. Я не стаў чарадзеем,
Цябе не збярог ад бяды.

* * *

Я Табе жадаю шчасця, шчасця,
Каб каханне сталася Тваім,
Каб пачуцці сталі вечнай страсцю,
Падуладнай страсці маладым.

Каб душа спявала і гарэла,
Саґравала ў студзеньскі мароз.
Напішу на снезе белым-белым:
Адпускаю, хоць кахаю ўсё ж.

* * *

Адпушчу Цябе на волю.

Адпушчу.

І чакаць не буду болей.

Не хачу.

Не скажу Табе пра шчасце.

Прамаўчу.

Адпушчу Цябе на волю.

Адпушчу.

KAMUNIKAT.org

* * *

А ў нас з Табой кахання не было.
Пустую страсць назвалі мы каханнем.
У дом халодны сцежкі замяло,
А мы ішлі, каб радаваць світанне.

А мы ішлі і думалі: жывём!
І ў рай лятаем на спатканне з Богам.
І знікла ўсё, растаў халодны дом,
І ясна зараз: не было нічога.

KAMUNIKAT.org

* * *

Быў дождж. І мы пад мокрым парасонам
На мокрай лаўцы ў парку гарадскім
Чыталі шчасце ў позірках знаёмых
І нам яно належала адным.

А вецер словы, з вуснаў падхапіўшы,
Да сонца нёс, у космас да планет.
... Твой пацалунак... Не. Мне не прысніўся.
На вуснах мокрых ён пакінуў след.

* * *

У гэтым сне з Табою бачыў неба,
І мы ляталі ў сонных гарадах.
Пакліч ізноў! Табе ж сягоння трэба
Да новай зоркі блізкі выбраць шлях.

Зусім не цяжка. Гэта мне пад сілу —
Табе дарогу ў неба паказаць.
Якое шчасце — мець за спінай крылы,
Калі душы так хочацца лятаць!

* * *

Мы гулялі, нібыта ў цацкі,
У пачуцці гулялі з Табой.
Мо таму мой настрой дзівацкі
Кожны раз гаварыў мне: пастой,

Не ляці безвыходна ў бездань,
На раскідвай пачуцці свае.
Лепш каханне ў пакутах зведай —
І паэзія зноў ажыве.

* * *

А мне з Табой не быць адной планетай,
Дарога нас прыводзіць у тупік:
Не любіш Ты класічныя санеты,
А я да піва неяк не прывык.

Не зведаць мне атруты папяроснай,
Табе ад вершаў радасць не спазнаць.
Не плачу я, што ў дождж сыходзіць восень,
Бо так Цябе лягчэй мне забываць.

KAMUNIKAT.org

**Перад зімой**

Вясною першага кахання
Намаляваў няшчасны твар
І запаліў начны ліхтар,
Вясною першага кахання.

Да лета першага спаткання
Закрыў я свой магнітны шлях
І ў чатырох сяджу мурах,
Да лета першага спаткання.

Пра восень першага растання
Ты раскажы аднойчы ў сне
І паўтары на яве мне,
Пра восень першага растання...

## З нізкі “МАЯ ЗІМОВАЯ СТАЛІЦА”

### Навагрудак

Мне сніўся Ты і Навагрудак.
І я па горадзе сумую
Ў зіму завейную і злую,
Мне сніўся Ты і Навагрудак.
Ізноў я голас мамы чую.
І ёй адной скажу пра смутак.
Мне сніўся Ты і Навагрудак —
І я па горадзе сумую.

* * *

За акном шалее завіруха —
Там няма для танцу перашкод.
І яе верлібравыя рухі
Прымушаюць сесці ў маралёт.

І нясуцца думкі. Невядома
Дзе прытулак знойдуць, ажывуць...
З мітусні вярнуся я дадому,
Каб паветра чыстага глынуць.

* * *

Зіма ў зімовым Навагрудку —
Старонка памяці маёй
У кнізе “Радасны настрой”.
Зіма ў зімовым Навагрудку —
То мой шчаслівы неспакой...
І еду я ізноў на Рутку...
Зіма ў зімовым Навагрудку —
Старонка памяці маёй.

* * *

Мая зімовая сталіца,
Я ведаю, што ты не спіш,
Пад снежнай коўдраю — маўчыш,
Мая зімовая сталіца.
Вакол — наваградская ціш...
Яна мне мінскай ноччу сніцца,
Мая зімовая сталіца.
Я ведаю, што ты не спіш.

KAMUNIKAT.org

**Каханне — сталіца вясны**

Мяне не пускае мароз
Туды, дзе штодзённае лета,
Дзе песня наваградскіх слёз
На вуснах заморскіх сагрэта.

Гучыць яна з хуткасцю сноў.
І ў снах я з Табою знікаю.
І позіркі нашы без слоў
Гавораць: “Цябе я кахаю!”

І лета сталіца й зімы
Адзінай сталіцаю сталі —
Сталіцаю вечнай вясны,
Каханнем яе мы назвалі.

* * *

Спіць Грыбнёўскі лес…
І цішыня…
Толькі зоркі шэпчуцца задумна.
Вось упала на зямлю адна.
Ёй услед — другая…
Ў лесе шумна.

KAMUNIKAT.org

**Ноч у Міры**

Прысніся мне ў глухую ноч грымотай
І навальніцай будзь, кахай мяне —
І стану я Тваёй начной пяшчотай,
Якой і час бяздушны не кране.

І будзем мы дажджліваю парою
Сваю вясну забытую шукаць,
І ажывуць няспраўджаныя мроі,
Каб дождж над Мірскім замкам разагнаць.

Прысніся мне ў глухую ноч грымотай
І навальніцай будзь, кахай мяне...

## Горад-возера

Човен адзінокі
Ў Свіцязі начной.
Да яго па зорках
Я плыву. Пастой,

Поўня-каралева,
Ты не пі ваду,
Па тваёй дарозе
Горад я знайду.

Горад старажытны —
Свіцязь паўстае.
І не поўня — сонца
Радасць з неба лье.

Кожны тут шчаслівы.
Свіцязь — горад-сад.
Застаюся ў казцы.
Не хачу назад.

1996-2006

**Аблокі**

Ваду пры сабе трымаюць
Аблокі — карніз Зямлі.
Па кроплях жывых кідаюць,
Каб мы на Зямлі былі.

Натхненне даюць паэтам,
Якія ствараюць свет...
Засну. Ты накрыеш пледам
Не створаны мной санет.

І снег перастане сыпаць,
Надыдзе бяссснежны дзень.
Паклічаш мяне, каб знікнуць
У лівень, нібыта ў цень.

## Настроі

### 1

### Песімістычны

У гэтым свеце больш няма кахання.
Халодны вецер зашпіліў вясну
І Ты знікаеш у абдымках сну.
У гэтым свеце больш няма кахання.
І я адзін пад раніцу засну,
Не зведаўшы палёту да маўчання.
У гэтым свеце больш няма кахання.
Халодны вецер зашпіліў вясну.

### 2

### Аптымістычны

Ты мне падорыш “sms-прызнанне”,
Што я ў жыцці Тваім адзіны цуд.

І я паверу: Ты са мной, Ты тут…
Ты мне падорыш “sms-прызнанне”.
І сны мае пазбавіш ад пакут,
І стане песняй нашых душ маўчанне.
Ты мне падорыш “sms-прызнанне”,
Што я ў жыцці Тваім адзіны цуд.

KAMUNIKAT.org

* * *

А я хачу на Лысую Гару
Сустрэць вясну ля вогнішча свабодна.
І вершы там агню я падару.
Табе адзін пакіну. Самы родны.

І Ты вянок пралескавы спляцеш
Са слёз зімы. Ён будзе рыфмаваны.
І мне падорыш самы родны верш,
Які ў душы маёй залечыць раны.

* * *

Не засну без Цябе.
І начамі
Буду сон праганяць.
Зазвіняць за дзвярыма ключамі...
Я змагу адгадаць,
Што Цябе там няма,
Што суседзі
Проста выйшлі курыць.
І я ведаю:
Ты не прыедзеш...
Можна мне Цябе сніць?

* * *

Святло гасіць...

Запальваць...

І гасіць,

І не пісаць ні слова...

Немагчыма

Цябе ў прыемным сораме забыць.

За Твой пагляд пяшчотнасці

Вачыма

Твае калені, рукі цалаваць —

І паляцець з Табою,

І забыцца.

Святла гасіць...

Запальваць...

Засынаць.

Нам будуць сны аднолькавыя сніцца.

* * *

Чароўная, вачэй Тваіх бяздонне...
Знікаю я і Ты са мной знікаеш.
І падае да нашых вуснаў поўня
Салодкая. З Табой яна такая.

І хмарамі начное неба сцеліць
Шыкоўную для нашых сноў прастору.
Давай сягоння марам будзем верыць.
Тады і заўтра неба іх паўторыць!

* * *

О Божа, якая радасць —

Твой позірк такі ж як мой.

KAMUNIKAT.org

* * *

Зіма апошнім часам не смяецца,
Хаця яшчэ бадзёрая крыху…

Быў снег.
І сонца.
Помніш, мы пагрэцца
Забеглі ў краму кветак на рагу?
У вокнах снег наіўна лужы поўніў.
У краме – мы,
І кветак жаўцізна.
Тваё дыханне – цёплае – так роўна
Кранула ружы –
І прыйшла вясна.

## SERVUS — REGINAE*

Не призывай. И без призыва
Приду во храм.

***А. Блок***

Самотай поўніцца чаканне.
Табе пішу:
“Давай прыдумаем каханне.
Я не хлушу.

Я верны раб Табе, царыца, —
Слуга. Паэт.
І я ў Тваіх руках — сініца,
А Ты — мой свет.

З Табой хачу дзяліць паветра —
Жыцця прастор.
Мы разам будзем цёплым ветрам
Ляцець да зор”.

---------------------------

* Servus — reginae (лац.) — слуга — царыцы.

## Афіша з мінулага

А на паперы больш ніхто не піша.
Яе з часоў мінулых не прывозяць.
Апошні ліст — забытая афіша —
Сваё жыццё шукае, не знаходзіць.

Імчацца зоркалёты. І бяздумна
Афішу вецер зрэдку пацалуе.
Ёй на планеце бездухоўнай сумна.
Планета не кахае, а ваюе.

KAMUNIKAT.org

* * *

Правяраюць холадам каханне?..
Ледзяны касцёр я запалю.
Будзем грэцца. Вогнішчам змяркання
Цётка Праўда прыйдзе на зямлю.

Прывітаем. Песняй запытання
Мы аблокі ў жменю сабяром.
— Там, дзе холад, — там няма кахання,
Бо каханне створана цяплом.

* * *

Зімнасць не дасць мне цяпла.
Сонца для сэрца — жыццё.
Мне не заменіць кастра
Лютай завеі выццё.

Страшна замерзнуць зімой,
Страшна ў пакуце згараць.
Хочацца быць з Табой,
Толькі Цябе цалаваць?!.

* * *

Зацерусілася самотная сцяжынка.
Да зорак месяц выплыў, і паўзмрок
Ахутаў сонны горад. Незнарок
Зацерусілася самотная сцяжынка.
Мяне на Свіслач клікалі сняжынкі.
І дом Твой вабіў, прызначаў спатканне,
Каб я чакаў, блукаў ажно да рання,
Ахутаны ў эстрадныя сняжынкі;
Каб на вачах з'явіліся ільдзінкі,
Што Ты са мною золак не сустрэла,
Не паблукала берагам ля елак...
Зацерусілася самотная сцяжынка.

1997

* * *

Маркотна пазірае месяц.

І зоркі стомленыя спяць.

Я думаю:

Каханне — вецер.

А дзе і як яго шукаць? —

Ніхто не зможа адказаць.

Ні месяц, што вартуе неба,

Ні зоркі, што вартуюць нас.

Ніхто. Нічым не дапаможа...

Каханне — вечнасць.

Людзі — час?..

1996

* * *

Ты мяне намалюеш сёння.
Не стрымаю ад шчасця слёз.
І тады нагадае поўня
Парасон… І пачнецца дождж.

Будзе сыпаць ён кроплі-здані
Па няспраўджаных марах-снах.
У Нясвіжы прачнецца пані…
Ты са мною забудзеш страх.

* * *

Ты з нябёсаў сыдзеш на зямлю —
Цеплынёй пазначыцца чаканне.
Я Табе ў далоні пералью
Акіян бяздоннага кахання.

Халадэча знікне. І тады
Назаўсёды буду я з Табою.
І з-за хмараў месяц малады
Нам насыпле зорнага спакою.

* * *

На снезе сляды курапатак —
Застылыя слёзы вясны.
Мы прыйдзем аднойчы дахаты.
Напоўняцца радасцю сны.

Мы знойдзем таемную існасць,
Забудзем вядзьмарку-зіму.
З пляча Твайго змерзлую сціпласць
Я вуснамі моўчкі здыму...

**Мой лабірынт**

Ты жывеш у маім лабірынце.
Я сябе ў лабірынце згублю.
Закаханым зраблюся там прынцам
І нясмела прамоўлю: “Люблю!”

Лабірынтператворыцца ў поўню.
Чарадзейства — усмешка Твая —
Сэрцы гукамі флейты напоўніць.
Будзем з поўняй лунаць — Ты і я.

* * *

Акно напалохана раніцай.

Твой вобраз ізноў усміхаецца...

Так я прачынаюся стомлены,

Знікаю з павольнымі промнямі

Туды, дзе аблокі цалуюцца,

Дзе Ты на знаёмай нам вуліцы

Чакаеш пагляду пяшчотнага.

Адключыш на вечар свой сотавы.

Цябе не пазнае кавярніца*.

Нам нашыя вобразы з’явяцца.

----------------------

* Кавярніца – я прапаную гэтае слова замест “барменша”, “афіцыянтка”.

* * *

Малявацъ на сурвэтцы раніцу,
Заплятацъ яе ў новы дзень,
Павязацъ Табе шалік памяці,
Зрыфмавацъ карагод падзей...

І растане тады ад зайздрасці
Зазімелая ноч-рака.
І падорыць мне слёзы радасці
Дакрананнем Твая рука.

KAMUNIKAT.org

* * *

Па праспекце Скарыны шматлюдным
Мы ішлі, запаволіўшы крокі,
І спявала душа, быццам лютня;
Уздымалася цела ў аблокі.

І анёл — вечна Боская птушка —
Нашы рукі вучыў цалавацца
І нябеснай сцяжынкаю вузкай
Вёў туды, дзе павінны застацца.

2000

KAMUNIKAT.org

* * *

Вясна засынала на кветках,
Фіранкі зляталі з акна,
І поўня ў стаптаных танкетках
Збірала аблокі адна.

Зашторыла зорнае поле,
Прамовіла сціпла: “Антракт...” —
Пусціла аблокі на волю,
Каб з імі мы танчылі ў такт.

* * *

Касмічныя прайшоўшы скразнякі,
Схаваўшы ў думкі рытмы сонцаветру.
Мяне чаруеш дотыкам рукі,
Як песняй, не вядомаю дагэтуль.

Яна — ад зоркападавай вясны
У соннай мары нашага паўцарства
Яшчэ раз загучыць. І мы адны
Палоннікі бясконцага бунтарства.

KAMUNIKAT.org

## Кавярні на аўтастрадзе

Я новую будую аўтастраду
Працягласцю Маё — Тваё жыццё
З прыпынкамі нясцерпнага пагляду,
З разметкаю “пункцір у забыццё”.

На гэтай аўтастрадзе прыжывецца
Кавярняў закаханых ланцужок.
Мы будзем у кавярнях гэтых грэцца,
Заблытаныя ніткамі дарог.

## “МАРОКА... МАРЫ... МІТУСНЯ...”

* * *

Я хачу паехаць у Марока —
У краіну цёплага пяску,
Што падобны на жыцця раку.
Я хачу паехаць у Марока.
І аднойчы я туды ўцяку,
У пясок схаваюся глыбока.
Я хачу паехаць у Марока —
У краіну цёплага пяску.

**А я шукаю, дзе яна**

Марока...

Мары...

Мітусня...

І я з зімы трапляю ў лета,

І я шукаю, дзе яна,

Мая арабская Джульета.

Мне кажа пра харам* мула,

На першую вядзе малітву.

А я шукаю, дзе яна,

І з лёсам уступаю ў бітву.

---

* Харам – тое, што забаронена; грэх.

* * *

У Марока змагу я жыць.
У Рабаце?!. А можа ў Фесе…
Там мой лёс закаханым быць.
Ты жывеш ля Медзіны* дзесьці.

Адшукаю Цябе, знайду
У натоўпе арабскіх вуліц.
Я скажу, што Цябе люблю,
Каб усе на Медзіне чулі.

--------------------

* Медзіна — галоўная плошча ў любым старажытным арабскім горадзе, раней сам горад, куды з Меккі пераехаў прарок Махамед.

**Жадзі***

Мне аднойчы Ты прыснішся
І са мною будзеш, Жадзі.
З лабірынту знойдзеш выйсце
І мае надзеі спраўдзіш.

Мне падорыш лепшы танец
Без чадры. У ладных строях...
Танцам сэрца мне параніш,
Ну, а потым — супакоіш.

І спакойны дух Сахары,
Лабірынты вуліц Феса
Нам свае падораць чары
На Медзіне белых вершаў.

------------------

* Жадзі — арабскае жаночае імя.

## Спраўджанне сну

Ішлі насустрач ваданосы.
У іх спытаўся пра Цябе.
Яны сказалі Ты не ў Фесе,
Нам нельга бачыцца. Харам.

Сказалі й зніклі ў лабірынце
Медзіны Феса. Я стаяў
І слухаў голас муэдзіна,
Які душу да слёз крануў.

... Праз дзень купіў сабе бабушы*
І ў месца сноў усё ж пайшоў,
Каб назаўсёды развітацца
З прыдумкай яркаю. А там

Чакала Ты мяне самотна.

Ты верыла, што я прыду.

І нашы сэрцы заспявалі

Лірычнай песняю пяшчоты.

--------------------

* Бабушы — род мяккіх туфляў.

* * *

Ты пярсцёнак мой згубіла ў Фесе
Залаты, у залатых пясках,
У сваіх не зберагла руках.
Ты пярсцёнак мой згубіла ў Фесе,
Да кахання мне закрыла шлях,
І чужою стала Ты нявестай.
Ты пярсцёнак мой згубіла ў Фесе
Залаты, у залатых пясках.

**Мактуб***

Па пясках неабдымнай Сахары
Я ішоў. Я шукаў Цябе...
Мне тады бедуіны сказалі:
— Па жыцці нас мактуб вядзе.

Я не ведаў, што значылі словы.
Я не слухаў... І слухаў іх:
— Для Марока ты госць выпадковы.
А мактуб?.. Ён у снах тваіх.

... Я не змог зразумець бедуінаў.
Я свой лёс вызначаю сам!
А мактуб у Сахары пакіну,
Бо не веру, што ёсць харам.

--------------------

* Мактуб — тое, што напісана, лёс.

## Марока далёка

Марока ад мяне далёка.
І Ты далёка ад мяне,
Хоць мне здаецца: пару крокаў —
І ўраз адлегласць праміне.
І будзе зноўку ў полі зроку
Жыццё такое, як даўней...
І я ўздымаюся ў аблокі.
Лячу туды, дзе жыў раней...
Марока.

І мы сустрэнемся ў вясне.
І Твой пагляд такі глыбокі
Мне скажа, што чакаў мяне.
І сэрцу стане вельмі лёгка —
Яго каханнем закране
Марока.

## Вяртанне ў Рабат

Я вазьму і прыеду туды,
Дзе чакае мяне пустыня.
Там аднойчы згубіў я сляды
Да каханай сваёй адзінай.

Я тады не адчуў як лепш.
А цяпер у пясках Магрыба*
З успамінаў складзецца верш...
Мне пустыня дазволіць выбар.

Назаўсёды вярнуся ў Рабат —
У сталіцу цудоўнай ночы,
Дзе жыццё перасыплю назад,
Каб з Табой па Медзіне крочыць.

---------------------

* Магрыб — арабскі Захад, у які ўваходзяць краіны Туніс, Алжыр, Марока.

* * *

І пачуў у адказ я “наам”*,
І паверыў няспраўджаным снам.
Ты сказала:
“Сягоння прыду на спатканне”.
І Айт-Бенхадду*
Нас схавала ў абдымках сваіх.
А назвала іх “Ноч для дваіх”.

--------------------

* “Наам” — у перакладзе з арабскай мовы “так”.

* Айт-Бенхадду — крэпасць у Марока.

**Мараканка**

Не крыўдуй на мяне, мараканка,
Што з Табою не быў да світанку.
Я адзін вывучаў Сахару
І сустрэўся з пясчанай завеяй.
Пра Цябе па-ранейшаму мару.
Ты — мая мусульманская фея.

Мы яшчэ пагуляем з Табою.
Я жаданні Твае супакою.
Мараканскі апусціцца вечар —
І пачнуць распаўсюджвацца чары.
І Цябе абдыму я за плечы,
Каб з Табою застацца ў Сахары.

* * *

Стварaю з пёркаў крылы,
Каб паляцець туды,
Дзе разам мы хадзілі,
Шукалі гарады,
Дзе ў нас была пустыня
Неправаслаўных сноў,
Якія мы згубілі
Ў правінцыі вятроў.

## Рубаі

* * *

Мы пясчанай завеі разгадвалі чары,
Як глыталі пясок у палоне Сахары.
Мы шукалі аазіс з жывою вадой,
Што заўсёды здзяйсняе найсветлыя мары.

* * *

І сустрэне мяне Касабланка.
А дзяўчына адна, мараканка,
Мне раскажа пра цуда-Сахару.
І прабуду я з ёй да світанку.

* * *

Непаўторная ў Фесе Медзіна
І мячэці... І кліч муэдзіна
Мусульман на малітву збірае.
Да ад'езду з Магрыба гадзіна.

## Сумнасць

Балючая сягоння сумнасць —
Цябя няма ў маім натхненні.
Імкнуся пра Марока думаць.
А сумнасці не стала меней.

Каханне раздзяляюць межы.
Яны ствараюць кнігу болю.
Я сумныя складаю вершы.
Праз іх бліжэй мне быць з Табою.

KAMUNIKAT.org

* * *

А я, як прывід у жыцця палоне
Без слоў, не сказаных Табой услых.
Мяне цалуе мараканка-поўня
І плача вершамі пра нас дваіх.

Цябе шукаю ў тэлефоне ночы,
А мне ў адказ: “Ты недаступна зноў”.
Ні чуць, ні бачыць Ты мяне не хочаш
І ў нас не будзе мараканскіх сноў.

**Падман**

Мне поўня з мінарэта прашаптала:
“Забудзь яе. На сэрцы ўжо не ты...”
Ад словаў гэтых неспакойна стала.
Няўжо так лёгка спальваюць масты?

І думаў я пра наша неспатканне
Пад поўняй мараканскаю ізноў.
Не верыў поўні. Ведаў, што каханне
Сапраўднае ў Марока я знайшоў.

* * *

Мару аб Маракешы.
З Агадзіра іду я пешшу
І складаю ў дарозе вершы
Мараў аб Маракешы.
Ай, дарэмна сябе я цешу,
Не дайду я сягоння пешшу
З вершамі да Маракеша.

KAMUNIKAT.org

* * *

Атлантычны акіян
Пацалуецца з Марока
І схаваецца ў туман,
Закаханасці падман,
Што народжаны ў аблоках.

Я прыеду ў Маракеш —
Мітуслівасці сталіцу.
Ў Маракешы Ты жывеш.
На Медзіну прывядзеш,
Каб Медзінай падзівіцца.

Мы навучымся знікаць
Атлантычнаю вадою.
Я змагу Цябе кахаць
І пачуцці не хаваць,
І заўсёды быць з Табою.

* * *

Ў Маракешы сёння сорак пяць
І смяецца сонца, быццам лава,
І баяцца хмары танцаваць —
Ім на небе летнім месца мала.

А мяне ратуе з мятай чай.
Я чакаю ноч, каб прагуляцца.
І прашу ў яе: “Натхненне дай.
Ад спякоты ў ім хачу схавацца”.

**Парк у Маракешы**

У вечных снежных шапках
Атласкіх гор вяршыні,
А ў нізе лета ў красках:
Акацыі, вяргіні...

Чароўны парк Мамуна
Зіму ў нябёсах бачыць
І марыць, што фартуна
Што-небудзь перайначыць.

**Развітанне**

Аддам Цябе забытай песні лета,
Аддам Цябе, не буду шкадаваць.
Свае пачуцці я складу ў букеты,
Іх на Медзіне стану прадаваць.

І нехта купіць, як сваё каханне
Купляюць шэйхі. Грош — яму цана.
Мне ж застанецца кветак шкадаванне
І ў скрыпцы лета рваная струна.

* * *

Забыты верш знайду ў забытай кнізе.
Чароўнай песняй верш мой загучыць.
Яе пачуеш і сягоння прыйдзеш
Мяне арабскай мове навучыць.

І будзем мы знаёміцца з Магрыбам,
Забытам марам зноў дарыць палёт...
Снягурка-ноч пастукаецца ў шыбу,
Падорыць нам арабскі Новы год

* * *

О цуд! Мараканская пальма,
Цяпер ты жывеш у мяне.
Табе адкрываю я тайну,
Што снег гэты хутка міне.

А ў снах — караваны вярблюдаў
І сонца ласкавы пагляд...
Калі ты захочаш, то будзе
І ў Мінску маленькі Рабат.

**Бусел**

Прыляці мой бусел з роднай Беларусі,
Да мяне ў Марока прыляці.
Прынясі мне, бусел, подых Беларусі,
З Навагрудка весткі прынясі.

Раскажы мне, бусел, дзе лята́лі гусі,
Зімавалі дзе ў якіх краях?
Раскажы мне, бусел з роднай Беларусі,
Як красуе жыта на палях.

Прыляці мой бусел, белакрылы бусел,
Над Магрыбам доўга пакружы.
Пакажы мне бусел, з роднай Беларусі,
На Радзіму шлях мне пакажы.

* * *

Мой вобраз любы, дня майго святло,
Мяне сустрэнь у гэты час вясенні.
Я — вецер.
Праз вятроў чужых лязо
Лячу
Твае пацалаваць калені.

KAMUNIKAT.org

* * *

Вандраваць заўсёды я хачу з Табою,
Каб ніхто знаёмы на вачах не быў,
Каб духмяным сенам пахла за ракою, —
Там, дзе месяц летні цалаваў абрыў.

У рацэ кахання пакупацца б зноўку,
І забыцца крыўды, што дажджом сплылі,
І заўсёды верыць: новую вандроўку,
Мы таксама здзейснім па сваёй зямлі.

* * *

У ноч, калі народзіцца субота,
Мяне адчуеш Ты. І ў снах Тваіх
Я буду штохвілiннаю пяшчотай,
Падоранай суботай для дваіх.

І знойдзем мы ў паглядах паратунак.
Не бойся ўдзень каханне захаваць.
Як не кладзі — чытаецца на рунах,
Што мы з Табой народжаны кахаць.

* * *

І дыхае ноч прахалодай,
Сціхаюць верлібры машын,
Мяняецца снежная мода —
Вясна вышывае кілім.

Тваe схаладнелыя пальцы
Імкнуся дыханнем сагрэць.
Ты позіркам просіш застацца,
Каб ноччу вясне расквітнець.

* * *

У сэрца пастукала вечнасць,
І сэрца цяпер не спявае.
Ты — думак маіх недарэчнасць,
Ты — сон. Мне Цябе не хапае.

Ты — птушка, якую калісьці
Лавіў я, не маючы сілаў,
Вясною пазбаўленых ісцін
І летам падрэзаных крылаў.

Ізноў недапісаны вершы.
Я іх дапісаць не паспею,
Бо восень, яшчэ не згарэўшы,
На горад накіне завею.

І будзе ў сумёты хавацца
Зімою спалоханы горад,
А песня з душы вырывацца,
Пачуцці кідаючы ў холад.

* * *

Я шукаю пачуцці іншыя,
Бо кахання ў душы няма
І на сэрцы маім — зіма.
Я шукаю пачуцці іншыя.
А вакол гаспадарыць мана
І з Табой на Зямлі мы лішнія.
Я шукаю пачуцці іншыя,
Бо кахання ў душы няма.

* * *

На лірычна сцюдзёным акне
Я спрабую Табе напісаць,
Як самотна і холадна мне
Адзінокае неба чытаць.

Я заўсёды з марозам на “ты”,
Каб Цябе кожны вечар чакаць,
Не знікаць без Цябе ў нікуды,
Не знікаць — з адзінотай блукаць.

Адзінотай заменіцца сінь,
Што пакінулі вочы Твае,
І не будзе класічных вяргінь
На лірычна сцюдзёным акне.

* * *

Хмарачосы на мальберце сноў
Ператворацца ў кахання здані.
Я прамоўлю баязліва зноў:
“Да сустрэчы. Не было кахання”.

І зімовыя спалю лісты
Там, дзе вершы неаднойчы спалі.
І не важна, што ў лістах ёсць Ты.
Мы ж з Табой зусім і не кахалі.

Ненапісаны прадам раман.
Мне сягоння дапаможа горад
Навагодні малявац падман
На мальберце закахана-хворым.

* * *

Напіша восень да кахання ліст,
А потым скіне на зямлю нясмела.
Схавае ў смецці вецер-эгаіст,
Каб сэрца восені зімой хварэла.

Я буду ведаць: лістападам слёз
Зіма ў тэатры атрымала ролі.
На жаль, яны сыграныя ўсур'ёз
І восень нашу не вярнуць ніколі.

* * *

Давай паўторым жнівень!!!
Не. Не позна,
Яшчэ не выпаў забаронай снег.
Давай паўторым жнівень,
Мне марозна,
Па сэрцы лёгкі халадок прабег.

Давай паўторым жнівень.
І ні слова.
Успомні: словы разлучылі нас.
Давай паўторым жнівень!!!
Выпадкова
Ён нам падорыць нечаканы сказ.

19.08.2004

* * *

Сны мае — зламаныя рыфмоўкі.
Два радкі... Шматкроп'е — і абзац.
Вобразы, як божыя кароўкі
Новым танцам зноў шукаюць пляц.

Я шапчу. Пускаю іх на неба —
Хай лятуць, бо там чакае Бог.
Прамаўчу, што Ты мне сёння трэба.
Адпусціў. Трымаць Цябе не змог.

* * *

І сум прыходзіць зноў.
І я збавенне
Шукаю ў недапісаных лістах.
І паўстаюць
Перад вачыма цені,
І нараджаюць невядомы страх.
І нехта зноў крычыць,
І падаюць аблокі
На тую глыбіню,
Дзе Твой самотны дом.
А я імкнуся жыць,
Пазбаўлены дарогі,
Спалоханы
Дапісаным лістом.

* * *

Два дні без Цябе...

Два месяцы...

Два гады...

Два стагоддзі...

А наперадзе тысячы дзён.

Ты са мною не будзеш,

Не вернешся,

Маё сэрца схапіўшы ў палон.

## Красавіцкі снег

**1.**

Каго паслухаў снег?
Напэўна, не мяне.
Ён служка Твой. Выконвае загады.
І холадам мой запаволіў бег.
Спыніў, каб я
Твае ўсвядоміў здрады.

**2.**

І ўсё ж кахаю, веру і люблю,
Малюю нам завоблачныя казкі,
У снах нямых забытае лаўлю
І ад жыцця чакаю сонца ласкі.

Дыханнем снег імкнуся растапіць,
Але зіма смяецца з гэтай дзеі.
Не ведае, як можна так любіць:
Любіць і жыць, не маючы надзеі.

**Спакусніца-самота**

Ізноў праводжу сонца без Цябе
І ранак сустракаю ў адзіноце.
Збалела сэрца верыць варажбе,
Паклоны біць спакусніцы-самоце.

Яна прымае, радуецца ім,
Атрутны шпрыц у думкі запускае.
У ім французскі модны нікацін.
Слабенькі ён і мне не памагае.

* * *

Пяшчотаю адбымкаў,
Якіх не існавала,
Натхненнем з фотаздымкаў
Душа не заспявала.
Сустрэча... І разлука.
На сэрцы пацямнела.
Так лёс узяў на рукі
Маё пустое цела.

* * *

Хачу стварыць малюнкі ў новай казцы,
Да ног упасці восеньскім лістом
І ўбачыць твар сапраўдны, а не ў масцы,
Пакінуць кветкі пад Тваім акном.

А потым плыць да берага крутога
І верыць сонейку ў халодны дзень...
Твайго ж кахання не сцярплю сляпога.
Ты лепш на вочы верасень надзень.

І не спыняй лістоту ў карагодзе —
Няхай танцуе развітальны вальс.
Ты мне пакінь свабоду на свабодзе
І не кажы, што раны гоіць час.

* * *

Блакнот выкідаю на сметнік
І думаю: “Ўсё! Забываю!”
Замёрз мною створаны кветнік...
Няўжо я Цябе не кахаю?..

Чаканым было развітанне.
Душа ачышчаецца... вершамі.
А кветкі?.. Шкада. У каханні —
У новым — мы будзем смялейшымі...

* * *

Памяць гарыць у пажары.
Пусты гасцінны мой дом.
І мара згубілася ў мары,
Каб заставацца святлом.



KAMUNIKAT.org

* * *

Вымярзае крынічка ля гаю.
Ліст пажоўклы пад снегам знікае.
Дзе ты?.. Чуеш?..
Адказу не маю,
Хоць гукаю!

А спявала крынічка калісьці
І спяшыла да вечнай ракі.
А цяпер —
Кружыць снежнае лісце...
На вякі?!

KAMUNIKAT.org

* * *

Акуляры... Халодныя ночы.
Акуляры... Халодныя дні.
Восень зноў мне цалуе вочы
І знікае ў Тваім агні.

Па бязлюдным праспекце крочу,
Даганяю, прашу: падмані!
Будзь са мной бесклапотнаю.
Моўчкі
Я загіну ў Тваім агні.

**Маё паветра**

Не хапае мне паветра —
Таго, якім дыхаеш Ты,
І я паміраю без Цябе
Гэтак жа, як і Ты
Памрэш аднойчы
Без паветра.

KAMUNIKAT.org

* * *

Душы маёй парваная струна.
Яе звяжу.
Яна ізноў зайграе.
Захоча восень музыку прыняць.
Дажджлівы дзень.
Мая душа спявае
Зусім не песні радасных сустрэч.
Яны цяпер жывуць у цуда-клетцы
Нібыта птушка…
Я ствараю верш
І плачу сам.
Надзея б’ецца ў сэрцы,
Што прыйдзеш Ты
І клетку разаб’еш
І нашы душы стануць яркай песняй…
Не.
Ты адна па восені плывеш.
І я плыву
Сам на сам з марай грэшнай.

**Верасень**

О, як Табою пахне верасень!
Як страшна мне яго ўдыхаць...
Ты ў лістападзе ціха вернешся,
І буду я Цябе чакаць.

Ты ў дажджазвон маланкай вернешся
Нясказанае мне сказаць...
О, як Табою пахне верасень!
Яго б да глыбіні спазнаць.

KAMUNIKAT.org

**Выпадкова**

Ён напісаў аднойчы казку...
Сабраў яе з уласных слёз,
Якія вырваліся з пасткі
Захмараных дажджом нябёс,

А потым іх паклаў на словы
І музыку калючых руж.
І так ён песняй выпадковай
Здзівіў парыжскі “Мулен Руж”.

**Натхненне**

Я шукаю натхнення вечнага,
А яно, як сняжынка белая,
То прыходзіць аднойчы вечарам,
То знікае ў завейным вэлюме.

І, як птушка, зімой спалохана,
Адлятае ў вандроўку доўгую.
А вясною звініць за вокнамі,
Каб на дзень усміхнуцца зноўку мне.

* * *

Шуфлюе дворнік снег,
Нядзельны снег шуфлюе.
Мой сон на гэтым збег.
Ён з раніцай начуе.

А ў сэрца цішыня.
Яна бунтарства просіць.
І сэрца не суняць...
Вярніся цуда-восень!

* * *

І прыйдзе той дзень, калі я знікну
Целам
І буду ляцець па снезе сноў
Белых.
Няздольны маўчаць, я проста крыкну
Смела:
— Глядзіце на снег, бо ён ізноў
Шэры.

* * *

Душа так прагне ачышчэння,
І думкі прагнуць чысціні.
Царква. Не людна. І абедня
Згарае свечкамі ў агні.

Іду на спеўную малітву
І стаўлю свечку за Цябе...

* * *

Сустрэчы нашай быць наканавана.
Душа чакае. Ты душу знайдзі
У храме тым, дзе музыка аргана.
Ты май у лістападзе абудзі.

... І быццам не было таго расстання,
Бо лета ў гэтым годзе не было.
Давай напішам музыку кахання.
Яна падорыць нам сваё святло.

**У ролі Юлія Шпілеўская**

Чароўная Барбара Радзівіл,
Прысніся мне, аддай сваю самоту.
Каханне не пражытае, пяшчоту.
Чароўная Барбара Радзівіл.

Захоплены самотаю Тваёй.
А Ты шчаслівай будзеш. Ты — багіня.
Ты — музыка. Ты — вечная. Загіну,
Захоплены самотаю Тваёй.

KAMUNIKAT.org

* * *

Тваё дыханне мне даносіць вецер —
Дыктуе вершы пра Цябе адну.
На небе поўня-чарадзейка свеціць
Нібыта лямпа. Я ізноў засну
Над вершам новым пра Тваю будзёнасць.
У снах кароткіх палятаем мы.
Аблокі вечныя пра нас успомняць
І нам працяглыя падорацць сны.

**Чужыя вятры**

Іголкай, ніткай, на хаду
Сшываў Пярун аднойчы кроплі.
Запісваў хмараў чараду,
Хацеў, каб людзі больш не моклі.

Чужых дажджоў, чужых вятроў
Чужыя гукі даляталі.
Пярун маўчаў. А ў брудзе слоў
Чужыя жабы не змаўкалі.

KAMUNIKAT.org

**Мальдзівы**

*(дыпціх трыялетаў)*

1

Быў землятрус той нечаканым
І смерць прынесці не хацеў,
Але ж цунамі наляцеў.
Быў землятрус той нечаканым
Індыйскі акіян не меў
Магчымасці парушыць планы.
Быў землятрус той нечаканым
І смерць прынесці не хацеў,

2

Вось так жыццё з зямлі знікае:
Вада на сонцы зіхаціць,
Ніяк не можа слёзы змыць.
Вось так жыццё з зямлі знікае.

А людзі марылі пажыць.
А мары, быццам хваля тая…
Вось так жыццё з зямлі знікае:
Вада на сонцы зіхаціць.

2004

KAMUNIKAT.org

* * *

Пустая душа, пустая —
Няма ні трывог, ні болю.
Растала зіма, растала.
Іду ад Цябе на волю.

Гартаю жыццё, гартаю,
Гляджу на яго малюнкі.
Адчаю хачу, адчаю!
Здыміце з душы карункі!

**Сонечная радасць**

Мне проста хочацца сагрэцца
Цяплом купальскага агню,
З душой змарнелаю сустрэцца,
Узняць пачуцці ў вышыню.

Душы прыслухацца парадаў
І з ёю толькі гаварыць...
Вось тая сонечная радасць,
Якую мару я набыць.

KAMUNIKAT.org

**Адзінота**

Я п’ю дзевяты кубак кавы.
І папярос ужо няма.
З балкона вецер не ласкавы
Гаворыць: “Зноў прыйшла зіма”.

А мне ўсё роўна. Я забыты.
І гэты дзень нібыта ў сне.
Чытаю вершы, як малітвы.
Яны жыццё вяртаюць мне.

## Закаханы анёл

Мяне пакінуў мой анёл-ахоўнік.
Ён зведаў слодыч вуснаў. Я адзін.
Душа замерзла. І падняўся помнік
На тонкім лёдзе, ямным ад маршчын.

Душа не цела. Можа і ўваскрэснуць,
Блукаць адна па тых слядах Тваіх,
Шукаць Цябе і летам цёплым — мерзнуць.
І зноў хварэць жыццём за нас дваіх.

Прашу, пакліч! Мяне, анёл, успомні.
Стаміўся я чакаць Твайго святла.
Твайго кахання дай чытаць мне слоўнік,
Крылом махні — шчаслівым буду я.

Патрэбна зараз мне Твая апека.
І я Табе сваю апеку дам.
Зірні з нябёс, анёл, на чалавека —
Убачыш Ты як добра будзе нам.

* * *

У гэтым халодным горадзе
Гарым адзінока знічкамі,
Не маем сапраўднай споведзі,
Звязаныя толькі звычкамі.

У гэтым халодным горадзе
Чакаем спагады, вернасці.
Кругамі заўсёды ходзіць ён —
Лёс наш, пад грыфам “вечнасці”.

* * *

А восені такой ужо не будзе:
Згарае неба, ветру не чуваць,
І недзе там мінорна ходзяць людзі,
Аўтобусы, як музыка, гучаць.

Так казачна фарбуе сонца дрэвы.
Для кожнага знаходзіць ладны строй.
Ледзь чутныя апошніх птушак спевы...
Які цудоўны ў восені настрой!

* * *

Дождж апошні першым снегам стаў
І зіма ступіла на палеткі.
Ноч дыхнула — і лядзяш упаў
На вясной пасаджаныя кветкі.

KAMUNIKAT.org

## Незададзеныя пытанні

*На целе,*

*Смомленым ад пяшчоты...*

*А.Спрынчан*

## Хацеў стаміцца ад пяшчоты

Ў зімовы дзень вясновых манекенаў,
Спытаць сябе: “Ну што? І хто ты?
Пустое цела ў крадзеным адзенні.

І раптам зніклі манекены.
Яны з калодай музыкі забытай
З вясною выйшлі на арэну.
Зімовы туз каханнем быў пабіты.

* * *

... І не верыць у сваю няверу!

Так і жыць, сваё жыццё паклаўшы

На заўсёды чыстую паперу,

Гэта ўсё паэзіяй назваўшы.

KAMUNIKAT.org

* * *

Чакаю дзень, калі растане цела.
Зямное цела злучыцца з зямлёй.
І беспрытульна будзе пад прыцэлам
Душа самотна шлях працягваць свой.

А гэты шлях вядомым накірункам —
Ці рай, ці пекла. Кожнага кране.
Стрываю ўсё. Гасподзь, пакінь мне думкі
І падары натхненне ў пекле мне.

* * *

Зямное пекла. Пекла за жыццём.

О, як шкада, што рай мне не адкрыты...

І так жыву.

Паэзія — мой дом.

І кожны верш — ад райскае малітвы.

KAMUNIKAT.org

* * *

*Мая мара пераломіць*
*шматлікія механізмы цёмных сіл,*
*якія тысячагоддзямі шкодна ўздзейнічалі на чалавека...*

*“Анастасия” У.Мегрэ.*

Зямля з’явілася. Зямля — каханне.
Цяпер жыве і Бог на ёй жыве.
І зніклі сцены, што хавалі ў тайне
Крыніцу праўды ад зямных людзей.

Яна з мінулага цячэ ў сучаснасць,
Яна энергіі дабра і зла
Звяла ў гармонію, а ўсім няшчасным
Кароткі шлях у райскі сад дала.

* * *

Нам ад зямлі не трэба адрывацца.
Яна — Жыццё, і Сутнасць, і Любоў.
Крані яе — і будзе ўсё вяртацца,
І райскі сад народзіцца ізноў.

Ён расквітнее так, як рос калісьці,
Калі Зямля маленькаю была.
Тады для нас была адкрыта існасць
І мы ішлі дарогаю святла.

... Сышоў адзін. За ім пайшлі другія,
Згубіўшы Праўду, Бога і Любоў.
Так і сягоння мы ідзём сляпыя
Не па зямлі. Між небам і зямлёй.

* * *

Душу маю наведаў злодзей.
Украў з яе пачуцці тыя,
Якія сёння рэдка знойдзеш.
І вочы ўжо ад слёз сухія,
І сэрца ўжо ад слёз сухое.
Маю душу наведаў злодзей...
Не першы раз было такое.

KAMUNIKAT.org

* * *

Ты — вершы,
Недапісаныя мной,
Сказаныя аднойчы
Там,
Дзе нас няма ўжо.
І да гэтай кнігі,
Не прачытанай Табою,
Аднойчы вярнуся я
Буслiным плачам.